# «НЕКАРАНАВАНЫЯ КАРАЛІ...»

Немагчыма вызначыць іншы шляхоцкі род, які на працягу стагоддзяў выклікаў бы ў адносінах да сябе самыя супярэчныя меркаванні і ацэнкі. Прадстаўнікі гэтага роду здолелі пакінуць прыкметны след у самых розных галінах дзейнасці — ад грамадска-палітычнага жыцця да культуры і асветніцтва. Яны бралі ўдзел у ваенных дзеяннях, на свае грошы будавалі друкарні ў Берасці, Нясвіжы ды іншых беларускіх гарадах, стваралі тэатры, пісалі музыку і лібрэта операў, збіралі і захоўвалі калекцыі кніг, дакументаў, карцінаў, зброі, рэдкасцяў і каштоўнасцяў. Яны рабілі гісторыю Айчыны і тады, калі бралі ўдзел у палітычных інтрыгах Вялікага Княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай, Расейскай імперыі, уплывалі на палітыку, эканоміку, культуру сваёй дзяржавы ў адпаведнасці з уласнымі патрэбамі, імкненнямі, густамі... Напэўна, чытач ужо здагадаўся, што гаворка ідзе пра Радзівілаў. На Беларусі было шмат магнацкіх родаў, але цяжка назваць больш славуты беларускі род.

Ганна з роду Радзівілаў кіравала Мазовіяй (частка Польшчы з сталіцай у Варшаве). Барбара Радзівілава была каралевай Польшчы і вялікай княгінёй Літоўскай. Каханне, якое выклікала яна ў сэрцы караля Жыгімонта II Аўгуста, называлі «каханнем стагоддзя». Сярод Радзівілаў былі буйныя кальвіністы (Мікалай Чорны, Януш, Багуслаў) і заўзятыя каталікі (Мікалай Крыштап Радзівіл Сіротка). Адзін з Радзівілаў быў сярод кіраўнікоў паўстання 1830 г. супраць расейскага прыгнёту. Першы Сойм пасля аднаўлення Польшчай незалежнасці ў 1918 г. адкрыў Фердынанд Радзівіл. Ягоны сын Януш падчас I сусветнай вайны з'яўляўся міністрам замежных справаў Польшчы. Сын Януша, князь Станіслаў, быў у сваяцтве з амерыканскім прэзідэнтам Джонам Кенэдзі (яны ажаніліся з сёстрамі — Жаклін і Лі Був'е).

Часы княжання Радзівілаў пакінулі свой адбітак на архітэктуры шмат якіх беларускіх гарадоў і мястэчак, такіх як Нясвіж, Мір, Клецак, Койданава, Слуцак. Намаганнямі Радзівілаў збіраліся і доўгія гады захоўваліся каштоўнейшыя калекцыі. Адна з іх — гэтак званыя 12 апосталаў — набыла незвычайную славутасць і зрабілася легендарнай, калі без следу знікла падчас напалеонаўскага нашэсця.

У Нясвіжы намаганнямі Францішкі Уршулі Радзівілавай і яе

мужа Міхала Казімера Рыбанькі быў створаны першы ў нас свецкі тэатр. З гэтым тэатрам непарыўна звязана творчасць другога прадстаўніка славутага роду Радзівілаў — Мацея, таленавітага кампазітара, лібрэтыста, выканаўцы... Яшчэ адна вельмі каларытная асоба з роду Радзівілаў — Кароль Станіслаў II Пане Каханку, дзівосы і незвычайныя паводзіны якога засталіся ў шматлікіх легендах, што дагэтуль можна пачуць у Нясвіжы.

Безумоўна, коратка расказаць аб усіх прадстаўніках гэтага старажытнага роду немагчыма. На жаль, у нашай краіне пакуль што не напісана ніводнай кнігі, якая была б цалкам прысвечана Радзівілам. У некаторай ступені запоўніць гэты прабел закліканы бібліяграфічны спіс «Некаранаваныя каралі Вялікага Княства Літоўскага: (Радзівілы ў гісторыі Беларусі)», надрукаваны ў бібліяграфічным бюлетэні «Новыя кнігі Беларусі» (1995, № 1), што выдае Нацыянальная бібліятэка Беларусі. Гэта — своеасаблівы даведнік, які пазнаёміць чытача з асобнымі выданнямі, артыкуламі з кніг, газетаў і часопісаў, прысвечанымі Радзівілам. Складальнік не абмінуў замежныя крыніцы і старыя выданні.

Спіс складаецца з некалькіх частак. Першая знаёміць з паходжаннем роду, яго асноўнымі лініямі і ўвогуле з той роляй, якую Радзівілы адыгралі ў гісторыі сваёй краіны. Другая частка прысвечаная асобным прадстаўнікам роду, сярод якіх Мікалай Руды, Мікалай Чорны, Барбара, Мікалай Крыштап Сіротка, Януш, Багуслаў, Міхал Казімер Рыбанька, Францішка Уршуля, Кароль Станіслаў II Пане Каханку, Мацей, а таксама нашчадкі роду, нашыя сучаснікі. Кароткія біяграфічныя даведкі суправаджаюцца спісам літаратуры, прысвечанай згаданай асобе. Апошнія два раздзелы — «Партрэты Радзівілаў» і «Радзівілы ў мастацкай літаратуры» — адпаведна аблегчаць зацікаўленаму чытачу пошук неабходнай літаратуры.

Пазнаёміцца з бюлетэнем «Новыя кнігі Беларусі» можна ў кожнай масавай бібліятэцы. Выданне можна таксама набыць у кіёсках Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны.

**Кацярына ШЫШКОВА,**
**бібліёграф навукова-бібліяграфічнага аддзела Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.**

SPADČYNA (Heritage) Magazine
5, Staražoŭskaja St. Minsk, Republic of Belarus.